**Борбат Т.І. (Магілёў)**

# Мастацкая літаратура і гісторыя: спецыфіка выкарыстання міжпрадметных сувязяў (на прыкладзе вывучэння творчасці Максіма Танка і Аркадзя Куляшова)

Школьны курс беларускай літаратуры базіруецца на прынцыпе гістарызму, які па сваёй сутнасці з'яўляецца катэгорыяй міжпрадметнага зместу. Гэты прынцып "прадугледжвае канкрэтна-гістарычны аналіз мастацкага твора з далучэннем ведаў школьнікаў па гісторыі краіны" [1, с. 88]. Рэалізацыя такога роду міжпрадметных сувязяў асабліва важная, паколькі яны не толькі паглыбляюць агульнаадукацыйныя веды, але і развіваюць гістарычную памяць і гістарычнае мысленне школьнікаў, фарміруюць іх светабачанне, дапамагаюць глыбей асэнсаваць агульначалавечыя каштоўнасці.

У старэйшых класах галоўным прынцыпам канструявання зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца гісторыка-храналагічны прынцып, таму сувязі літаратуры і гісторыі набываюць большую значнасць. Вучні павінны не толькі ацэньваць канкрэтныя мастацкія творы з пазіцый сучаснага літаратуразнаўства, але і характарызаваць іх у кантэксце гістарычнага развіцця культуры свайго народа і чалавецтва, умець суадносіць канкрэтныя з'явы роднай літаратуры з асноўнымі эпохамі, перыядамі развіцця сусветнай літаратуры, мастацкімі напрамкамі.

Рэалізацыя такіх узаемасувязей пачынаецца са знаёмства з біяграфіяй пісьменніка, што дае непасрэднае ўяўленне пра яго ўдзел у грамадскім жыцці краіны, дапамагае выявіць сувязі паміж творчасцю пісьменніка і актуальнымі праблемамі часу.

У прыватнасці, пры разглядзе біяграфій А. Куляшова і М. Танка[1] варта ўзгадаць пра тое, як гістарычны лёс краіны адбіўся на ўласным лёсе паэтаў. Напрыклад, настаўнік можа выкарыстаць цікавыя матэрыялы В. Куляшовай, Л. Рублеўскай[2], звярнуцца да паэмы А. Куляшова "Далёка да акіяна". Урок можна правесці і ў форме завочнай экскурсіі "Па дарогах Аркадзя Куляшова". Папярэдне вучні падзяляюцца на тры групы, кожная з якіх рыхтуе "падарожжа" па "свайму" раёну (Хоцімскаму, Касцюковіцкаму і Мсціслаўскаму).

Разглядаючы творчы шлях М. Танка, можна праслухаць вучнёўскае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] У Праграме для ўстаноў адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (Мінск, 2013), на вывучэнне творчасці А. Куляшова і М. Танка ў 10 класе адведзена па тры гадзіны; таму ёсць падставы разглядаць біяграфіі паэтаў паэтапна, у кантэксце іх творчасці.

[2] Куляшова, В. Лясному рэху праўду раскажу: Літаратуразн. эсэ. / В. Куляшова. – Мінск, 1989. – 335 с.; Куляшова, В. "Паслаў мне лёс блакітную раку..." / В. Куляшова // Род. слова. – 1994. – № 2. – С.3 – 7; Куляшова, В.Гісторыя аднаго верша. Вершы пра каханне / В. Куляшова // Род. слова – 1997. – № 2. – С.178 –190; Куляшова, В. Лебядзіная песня Аркадзя Куляшова / В. Куляшова // Род. слова. – 2000. – № 9. – С, 104–105; Куляшова, В. У суровы век жыву сурова: Пра А.Куляшова / В. Куляшова // ЛІМ. – 2001. – 24 жн. –С. 13 – 15; Куляшова, В. З радаводу Аркадзя Куляшова / В. Куляшова // Род. слова. – 1996. –№ 1,2,4,5,7; Рублевская, Л. Карусель Аркадия Кулешова / Л. Рублевская // Беларусь сегодня – 2004. – 10 апр. – С.5 і інш.

паведамленне (5–7 хвілін) аб асаблівасцях сацыяльна-палітычнай сітуацыі, літаратурна-грамадскага руху ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гады, каб навучэнцы маглі зразумець, у якіх складаных умовах пачыналася паэтычная дарога творцы. Распавядаючы аб жыццёвых пуцявінах паэта, настаўніку могуць быць прыдатныя матэрыялы М. Мікуліча, В. Рагойшы, дзённікі самога аўтара і інш.[3]

Выкарыстанне на ўроках макетаў геаграфічных карт раёнаў Беларусі, звязаных з жыццёвымі і творчымі дарогамі М. Танка і А. Куляшова, фотаздымкаў альбо слайдаў, зборнікаў вершаў паэтаў, дзённікаў будзе спрыяць лепшаму засваенню матэрыялу.

Важна, каб старшакласнікі авалодалі ўменнямі выкарыстання гістарычных ведаў, неабходных для аналізу паэтычных твораў. Можна рэкамендаваць наступныя прыёмы ажыццяўлення сувязяў паміж літаратурай і гісторыяй: складанне “слоўніка эпохі” (М. Крот); складанне сінхраністычных табліц з улікам храналагічнай паслядоўнасці асноўных гістарычных падзей, падзей культурнага жыцця і важнейшых падзей з жыцця і творчасці пісьменніка; чытанне і аналіз фрагментаў прац вучоных-гісторыкаў, дзённікаў, успамінаў вядомых грамадскіх дзеячаў, літаратараў, дзеячаў навукі і культуры; чытанне і аналіз фрагментаў з твораў на тэму гісторыі, якія ў мастацкай форме аднаўляюць гістарычныя падзеі, ствараюць атмасферу пэўнай эпохі; выкананне індывідуальных заданняў (напрыклад, падрыхтоўка гістарычнага каментарыя да матацкага твора, гісторыі яго напісання); правядзенне завочных экскурсій па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка).

Аднак трэба заўважыць, што рэалізацыі сувязей гісторыі і літаратуры можа садзейнічаць нават школьны падручнік гісторыі, на аснове якога настаўнік можа пабудаваць сваё паведамленне.

Неабходнай умовай аналізу мастацкіх твораў з’яўляецца стварэнне духоўнай атмасферы эпохі пэўнага гістарычнага перыяду, выяўленне яе сувязі з важнейшымі падзеямі ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці краіны. “<...> Одна из первостепенных задач, встающих перед нами – создание на уроке образа эпохи. Быт и нравы, духовная атмосфера, культурные традиции и веяния <...> – все это должно предстать не в общих словах, а в панораме из конкретных фактов <...>”[2, с. 105], – слушна заўважае Н. Лейдэрман. Так, без аналізу сацыяльна-палітычнай сітуацыі 1930-х гадоў немагчыма разглядаць нізку вершаў “Маналог”, якую А. Куляшоў прысвяціў сваім рэпрэсаваным сябрам Ю. Таўбіну і З. Астапенку; верш “Спатканне” і паэму “Люцыян ТапОля” М. Танка.

Міжпрадметныя сувязі паміж літаратурай і гісторыяй прадугледжваюць таксама сучаснае прачытанне класічных твораў,

---

[3] Мікуліч, М. Максім Танк: На скразнях стагоддзя. / М. Мікуліч – Мінск, 1999. – С. 14 – 249; Мікуліч, М. На этапах // Мікуліч М. На зломе часу: Старонкі інтэрв’ю, дыялогі. / М. Мікуліч – Мінск, 1995. – С. 5 – 23; Рагойша, В. Шлях да Максіма Танка: Успаміны. Дзённікі. Дакументы / В. Рагойша // Полымя. – № 9. – С. 159 – 176; Танк, М. Дзённікі / М. Танк // Полымя. – 1996. – №№ 9 – 12; 1997. – №№ 1 – 9; Максім Танк: Фотаальбом / Аўтар тэксту В. Рагойша. – Мінск, 1985.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

актуалізацыю іх мастацка-эстэтычнага зместу. Сучаснае прачытанне “грунтуецца на аснове паслядоўнага гістарызму, які дазваляе знайсці і зразумець у мастацкім вопыце мінулага тое, што не страціла свайго значэння і належыць народу, чалавецтву” [3, с. 5]. На сённяшні дзень як гістарычныя разглядаюцца намі вершы М. Танка і А. Куляшова, напісаныя ў ваенныя і пасляваенныя гады (сярод праграмных твораў – “Над брацкай магілай”, “На паўмільярдным кіламетры”, “Я хаце абавязаны прапіскаю”, “Родная мова”). Напрыклад, аналізуючы верш М. Танка “Спатканне”, настаўніку варта адзначыць, што найбольш адметнае ў характарыстыцы лірычнага героя творчасці паэта як дакастрычніцкага часу, так і 1970 – 1980-х гадоў, – яго рэвалюцыйны пачатак. Лірычны герой паэзіі М. Танка не проста рэвалюцыянер-падпольшчык, ён актыўны пераўтваральнік жыцця на ўсіх этапах творчасці народнага паэта. У давераснёўскія часы – адмаўленне змрочнай рэчаіснасці і сцвярджэнне хараства і справядлівасці, у пазнейшыя – адмаўленне мітусні побыту і сцвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцей. Разглядаючы творы, неабходна не толькі паказаць, у якіх адносінах яны знаходзяцца са сваёй эпохай, з асобай аўтараў, але і асэнсаваць іх гуманістычна-эстэтычную скіраванасць.

Адзначым, што найбольшыя поспехі ў рэалізацыі такіх міжпрадметных сувязей будуць дасягнуты ў тым выпадку, калі настаўнік зацікавіць вучняў, зробіць іх актыўнымі ўдзельнікамі навучальна-выхаваўчага працэсу.

Такім чынам, цесная сувязь паміж урокамі роднай літаратуры і гісторыяй – дзейсны сродак, які забяспечвае самаразвіццё, самапазнанне асобы, паглыбляе ўменні параўноўваць, абагульняць, аналізаваць матэрыял па сумежных дысцыплінах, што, у канчатковым выніку, забяспечвае развіццё патрыятычных пачуццяў і духоўнага патэнцыялу навучэнцаў.

Літаратура


1. Лясун, Л. Развіццё творчага патэнцыялу асобы вучня сродкамі сумежных дысцыплін (маст. літ. і гісторыя) / В. Лясун // Бел. мова і літ. – 2003. – № 1. – С. 86–96.

2. Лейдерман, Н.Л. Об изучении теории литературы в старших классах / Н. Лейдерман // Литература в школе. – 2000. – № 5. – С. 104–111.

3. Івашын, В. Вывучэнне літаратуры на гісторыка-літаратурнай аснове. Тэарэтыка-метадычная праблема / В. Івашын // Роднае слова. – 2005. – № 9. – С. 4–6.


РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ